УДК 94:726.82:271.2-726.2(470)«08/10»

# МЕСЦЫ ПАХАВАННЯ ЕПІСКАПАЎ СТАРАЖЫТНАЙ РУСІ ЯК ПАКАЗЧЫК ІХ САЦЫЯЛЬНАГА СТАТУСУ

***І. Ю. Карпаў*** (ГДУ імя Ф. Скарыны)
Навук. кір. ***С. Ф. Верамееў,***
канд. гіст. навук, дацэнт

Згадкі пра месцы пахавання прадстаўнікоў вышэйшага духавенства нешматлікія. Адна з першых згадак пра смерць і наступнае пахаванне епіскапа адносіцца да 1159 г., калі цела мітрапаліта Канстанціна было пахавана ў Спаса-Праабражэнскім кафедральным саборы ў Чарнігаве [1, 215]. Больш падрабязныя звесткі аб пахаванні епіскапаў захаваліся ў Наўгародскіх летапісах. Напрыклад, Наўгародскі першы летапіс паведамляе, што ў 1156 г. у Пячэрскім манастыры быў пахаваны архіепіскап Ніфонт [2, 12]. Ужо пасля Ніфонта наўгародскія епіскапы ўдастойваліся пахавання ў гарадскім кафедральным саборы. Напрыклад, у 1163 г. епіскап Аркадзій быў пахаваны ў Сафійскім саборы ў Ноўгарадзе [2, 13]. Архіепіскап Ілья таксама быў пахаваны ў Сафійскім саборы [2, 19]. Удастоіўся гэтага і архіепіскап Гаўрыіл [2, 21]. Хутчэй за ўсе, такая тэндэнцыя была звязана з тым, што, пачынаючы з Аркадзія, кафедру ў Ноўгарадзе ўзначальвалі епіскапы з мясцовага духавенства.

Звесткі аб смерці і пахаванні епіскапаў у іншых цэнтрах Старажытнай Русі даволі скупыя. Ніканаўскі летапіс пад 1216 г. паведамляе, што епіскап Пахомій быў пахаваны ва Успенскім саборы ў Растове [3, 69]. Пры гэтым на пахаванні епіскапа прысутнічала шмат народу і нават сам князь. На пахаванні ўжо згаданага намі мітрапаліта Канстанціна таксама прысутнічала шмат народу [1, 215].

Такім чынам, асноўнымі месцамі пахавання епіскапаў былі кафедральныя саборы. Часам гэта маглі быць манастыры. На пахаванні епіскапаў маглі прысутнічаць як князі, так і баяры. Усе гэта дазваляе казаць аб высокім сацыяльным статусе епіскапаў Старажытнай Русі.

**Літаратура**

1. Полное собрание русских летописей : в 46 т. – Санкт-Петербург : Тип. Эдуарда Праца, 1862. – Т. 9 : Летописный сборник, именуемый Патриаршей или Никоновской летописью. – 282 с.

2. Полное собрание русских летописей : в 46 т. – Санкт-Петербург : Тип. Эдуарда Праца, 1841. – Т. 3 : Новгородские летописи. – 320 с.

3. Полное собрание русских летописей : в 46 т. – Санкт-Петербург : Тип. Министерства внутренних дел, 1885. – Т. 10 : Летописный сборник, именуемый Патриаршей или Никоновской летописью (продолжение). – 244 с.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова